Выходзіць 6 разоў у год. Выдаецца з 1996 г.

# БІБЛІЯТЭЧНЫ свет

НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫ,
ДАВЕДАЧНЫ,
НАРМАТЫЎНЫ
ВЫТВОРЧА-ПРАКТЫЧНЫ
ЧАСОПІС

1/130 2023
студзень – люты




**Заснавальнікі:**

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА
«НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА
БЕЛАРУСІ»

ГРАМАДСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ
«БЕЛАРУСКАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ
АСАЦЫЯЦЫЯ»

**Галоўны рэдактар**
ЛЮДМІЛА КІРУХІНА

**Рэдакцыйная калегія:**
А. КНІЖНІКАВА,
старшыня рэдкалегіі
Т. АДАМЯН
Ю. ГАЛКОЎСКАЯ
М. ІГНАТОВІЧ
У. КУЛАЖАНКА
А. МАЦВЕЕВА
І. САРОКІНА
А. СТРЫЖЭВІЧ
Р. СУХАРУКАВА
В. ШУТАВА
С. ЮРЭЦКІ

**Вокладка:**
В. Пшыбытка, Д. Макарэвіч
**Дызайн, вёрстка:**
М. Аляксандрава, Д. Макарэвіч
**Рэдактар** Н. Люцко

**Адрас для пісьмаў:**
Пр. Незалежнасці, 116,
220114, г. Мінск
**Тэлефоны:**
(+375-17) 368-97-75,
293-27-68
**Факс:**
(+375-17) 368-97-23
**E-mail:**
kiryukhina@nlb.by
edit@nlb.by
https://www.facebook.com/
bibliyatechnysvet/

**Выдавец:**
Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальная
бібліятэка Беларусі»

**Паважаныя падпісчыкі!**
Падпісацца на часопіс
можна ў аддзяленнях
Белпошты і Белсаюздруку.
**Падпісныя індэксы:**
індывідуальны **74895**
ведамасны **748952**

## У нумары:

**Афіцыйна**
3 Віншаванні

**Навіны ББА**
3 Сводный план работы общественного объединения «Белорусская библиотечная ассоциация» на 2023 г.

**Бібліятэка XXI стагоддзя**
6 *ГАЛІНА СЦЯПАНАВА.* Бібліятэкі Гродзеншчыны: рэгіянальныя адметнасці і цікавосткі ў дзейнасці

**У публічных бібліятэках**
10 *ЮРИЙ РАЧИНСКИЙ.* Востребованные формы работы библиотек Гомельской области с детьми и подростками
12 *ЮЛІЯ КАСЦЮК.* Памятаць, берагчы, аднаўляць: да 140-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа
15 *ЕЛЕНА ЗНАРОК.* Дневник интересных каникул
17 *НАДЗЕЯ СТАХАВЕЦ.* Бібліятэчны гарадок
20 *ЯНА ГРУБНИК.* Интернет-проекты в публичной библиотеке: от идеи к реализации
22 *ВОЛЬГА КАМЯКЕВІЧ.* І зноў сабраў нас Ганненскі кірмаш

**Інфармацыйныя рэсурсы**
24 *МАРИНА РУДАКОВСКАЯ.* Интеллектуальный капитал нации и роль библиотек в его развитии
27 *ТАТЬЯНА ЛАГОШ.* Электронный информационный ресурс Национальной библиотеки Беларуси «Известные имена»

**Юбілеі**
29 *ЛЮДМІЛА СЯМЕНАС.* Нясе святло дабрыні і асветы: дзіцячай бібліятэцы – 70 гадоў

**Канферэнцыі, семінары**
32 Рождественская встреча авторов публикаций научного сборника «Бібліятэчны веснік»

It is published 6 times a year. Published since 1996.

# LIBRARY world

POPULAR SCIENCE, REFERENCE, REGULATORY, SCIENTIFIC AND PRACTICAL MAGAZINE

1/130 2023
January – February

**Founders:**

STATE INSTITUTION «NATIONAL LIBRARY OF BELARUS»

PUBLIC ASSOCIATION «BELARUSIAN LIBRARY ASSOCIATION»

**Chief Editor**
Lyudmila Kiryukhina

**Editorial Board:**
O. Knizhnikova, Chairman of the Editorial Board
T. Adamyan
Y. Galkovskaya
M. Ignatovich
V. Kulajenko
E. Matveeva
I. Sorokina
E. Strizhevich
R. Sukhorukova
V. Shutova
S. Yuretskiy

**Cover** V. Pshibytko, D. Makarevich

**Design** M. Alexandrova, D. Makarevich

**Editor**
N. Lyutsko

**The address for letters:**
Nezavisimosti Ave, 116, 220114, Minsk, Belarus

**Telephones:**
(+375-17) 368-97-75, 293-27-68

**Fax:**
(+375-17) 368-97-23

**E-mail:**
kiryukhina@nlb.by
edit@nlb.by

https://www.facebook.com/bibliyatechnysvet/

**Publisher:**
State Institution «National Library of Belarus»

Subscription index:
Individual index **74895**
Departmental index **748952**

## In the issue

**Officially**

3 Congratulations

**News of BLA**

3 Consolidated work plan of the public association «Belarusian Library Association» for 2023

**Library of the XXI century**

6 *GALINA STEPANOVA.* Libraries of the Grodno region: regional features and curiosities in their activities

**In public libraries**

10 *YURIY RACHINSKIY.* Demanded forms of work of libraries of the Gomel region with children and teenagers

12 *YULIA KOSTYUK.* Remember, protect and restore: to the 140th anniversary of Yanka Kupala and Yakub Kolas

15 *ELENA ZNAROK.* Diary of interesting holidays

17 *NADEZHDA STAHOVETS.* Library town

20 *YANA GRUBNIK.* Internet-projects in the public library: from idea to implementation

22 *OLGA KAMYAKEVICH.* And again the Ganensky Fair gathered us

**Information resources**

24 *MARINA RUDAKOVSKAYA.* The intellectual capital of the nation and the role of libraries in its development

27 *TATYANA LAGOSH.* Electronic information resource of the National Library of Belarus «Famous Names»

**Anniversary**

29 *LYUDMILA SEMENAS.* Brings the light of kindness and enlightenment: the children's library is 70 years old

**Conferences, seminars**

32 Christmas meeting of the authors of publications of the scientific collection «Library Bulletin»

# Віншаванні



Рэдакцыя нашага часопіса віншуе ***Раісу Нікандраўну Сухарукаву***, дырэктара Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі, члена рэдакцыйнай калегіі часопіса «Бібліятэчны свет», з высокай дзяржаўнай узнагародай – медалём Фрацыска Скарыны (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 лютага 2023 г. № 34 «Аб узнагароджанні»).

Жадаем ёй моцнага здароўя, далейшых прафесійных поспехаў і дабрабыту!

Рэдакцыйная калегія часопіса «Бібліятэчны свет» віншуе ***Таццяну Мікалаеўну Адамян***, дырэктара Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна, з аб'яўленнем Падзякі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (распараджэнне Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 лютага 2023 г. № 22ра).



Жадаем поспехаў і моцнага здароўя!



**УТВЕРЖДАЮ**
Председатель Совета ОО «ББА»
В.Г. Кулаженко
«23» 02 2023 г.

**СВОДНЫЙ ПЛАН РАБОТЫ**
**ОБЩЕСТВЕННОГО ОБЪЕДИНЕНИЯ «БЕЛОРУССКАЯ БИБЛИОТЕЧНАЯ АССОЦИАЦИЯ» на 2023 г.**

## 1. Перечень основных мероприятий на 2023 г.

| № | Название мероприятия | Место проведения | Организаторы мероприятия | Кураторы (заместители Председателя Совета, председатели комитетов ОО «ББА») |
|---|---|---|---|---|
| | ***Февраль*** | | | |
| 1 | Подписание соглашения о партнерстве и сотрудничестве между Белорусской библиотечной ассоциацией и Красноярской библиотечной ассоциацией | | Председатель Совета ОО «ББА» | Кулаженко В.Г. |
| 2 | Онлайн-встреча «Забвению не подлежит: информационные электронные ресурсы патриотической тематики» | онлайн | Борисовское районное отделение ОО «ББА»; Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева; Вологодская областная универсальная научная библиотека им. И.В. Бабушкина (Российская Федерация) | Шалыгина Н.С., Копыток Е.С. |
| 3 | Поэтический телемост «Литература без границ» | онлайн | Борисовское районное отделение ОО «ББА»; Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева; МУК ГО «Город Архангельск» Централизованная библиотечная система (Российская Федерация) | Юрик И.В., Копыток Е.С. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4 | Онлайн-марафон, направленный на развитие интереса детей и подростков, а также родителей к чтению вслух произведений белорусской детской литературы «Чытаем разам. Чытаем услых. Тата, пачытай мне!» | онлайн | Борисовское районное отделение ОО «ББА ; Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева | Ахремчик М.П., Копыток Е.С., Швед Т.А. |
| | ***Март*** | | | |
| 5 | XXX Минская международная книжная выставка-ярмарка | г. Минск | Совет ОО «ББА» | Кулаженко В.Г. |
| 6 | Участие в международной акции «Флэшмоб ко Всемирному дню поэзии “Возьмите в спутницы поэзию”» | г. Борисов | Борисовское районное отделение ОО «ББА ; Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева; литературное объединение «Натхненне» | Шалыгина Н.С., Копыток Е.С. |
| 7 | «Книжный глобус – 2023» к Международному дню детской книги и дню рождения Ганса Христиана Андерсена | г. Борисов | ОО «ББА» (Комитет публичных библиотек); Борисовское районное отделение ОО «ББА»; Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева | Матвеева Е.И., Копыток Е.С. |
| 8 | Онлайн-школа компетентного библиотекаря. Занятие первое | онлайн | ОО «ББА» (Комитет по кадрам и непрерывному библиотечному образованию); Центральная городская библиотека им. Карла Маркса, г. Могилев | Юрик И.В., Стрелкова И.Б. |
| | ***Апрель*** | | | |
| 9 | Семинар «Электронно-библиотечная система как сервис доставки контента. ПРОФБиблиотека.by для системы профессионального образования» | г. Минск | ОО «ББА» (Комитет по кадрам и непрерывному библиотечному образованию) | Юрик И.В., Стрелкова И.Б. |
| 10 | Онлайн-школа компетентного библиотекаря. Занятие второе. Патентный поиск: основные понятия и возможности для библиотекаря учреждения образования | онлайн | ОО «ББА» (Комитет по кадрам и непрерывному библиотечному образованию) | Шалыгина Н.С., Стрелкова И.Б. |
| | ***Май*** | | | |
| 11 | Образовательный проект «Цифровая компетентность библиотекарей учреждений профессионально-технического и среднего специального образования: лицензионные электронные информационные ресурсы» | г. Минск | ОО «ББА» (Комитет по проектной деятельности; Комитет по связям с общественностью) | Шалыгина Н.С., Переверзева Ю.А., Рудаковская М.В. |
| | ***Июнь*** | | | |
| 12 | Семинар-практикум «Выбор в пользу библиотеки: как стать для детей и молодежи востребованным местом времяпрепровождения» | г. Борисов | ОО «ББА» (Комитет по организации обслуживания детей и подростков); Борисовское районное отделение ОО «ББА»; Городская библиотека № 1 ГУК «Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева» | Ахремчик М.П., Копыток Е.С., Швед Т.А. |
| | ***Август*** | | | |
| 13 | Международная акция «Читаем белорусские книги» | г. Минск | ОО «ББА» (Комитет по организации обслуживания детей и подростков) | Юрик И.В., Швед Т.А. |
| | ***Сентябрь*** | | | |
| 14 | Районный конкурс профессионального мастерства «Библиотека года – 2023» | г. Борисов | ОО «ББА» (Комитет публичных библиотек); Борисовское районное отделение ОО «ББА»; Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева | Матвеева Е.И., Копыток Е.С. |
| 15 | Скайп-конференция «Туризм объединяет» | онлайн | Борисовское районное отделение ОО «ББА»; Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева; Централизованная библиотечная система г. Пскова (Российская Федерация) | Шалыгина Н.С., Копыток Е.С. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 16 | Телемост «Молодежные культурные практики в библиотеках Беларуси и России» (участие молодых библиотечных специалистов) | онлайн | ОО «ББА»; Российская государственная библиотека для молодежи | Кулаженко В.Г. |
| | ***Октябрь*** | | | |
| 17 | Международный семинар «Перспективные направления работы библиотек с подрастающим поколением в современных условиях» | г. Минск | ОО «ББА» (Комитет по организации обслуживания детей и подростков) | Юрик И.В., Швед Т.А. |
| 18 | XXIII Международная научно-практическая конференция «Менеджмент вузовских библиотек» | г. Могилев | ОО «ББА»; Фундаментальная библиотека БГУ | Кулаженко В.Г. |
| | ***Ноябрь*** | | | |
| 19 | Литературный конкурс, посвященный творчеству Леонида Рашковского, борисовского поэта «Преодоление» | г. Борисов | Борисовское районное отделение ОО «ББА»; Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева | Шалыгина Н.С., Копыток Е.С. |
| 20 | Диалоговая площадка «Книжные блогеры» | г. Минск | ОО «ББА»; Республиканская научно-техническая библиотека | Ахремчик М.П., Шалыгина Н.С. |
| | ***Декабрь*** | | | |
| 21 | Встреча «Краеведческий туризм в библиотечном формате» | г. Борисов, онлайн | Борисовское районное отделение ОО «ББА»; Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева | Шалыгина Н.С., Копыток Е.С. |
| 22 | Подведение итогов работы ОО «ББА» | г. Минск | Совет ОО «ББА» | Кулаженко В.Г. Милюнец А.Ч. |

## 2. Методическая работа

| № | Название документа | Период разработки документа | Ответственные | Дата опубликования |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Участие в разработке СТБ 7.20–__. . . «Библиотечная статистика. Основные положения» | 1–4 кварталы | Министерство культуры Республики Беларусь; Национальная библиотека Беларуси; ОО «ББА» (Комитет по нормативно-регламентирующей документации, Пшибытко М.Г.) | I квартал 2024 г. |
| 2 | Участие в разработке примеров для «Инструкции ВАК по оформлению квалификационной научной работы (диссертации) на соискание ученой степени кандидата и доктора наук, автореферата диссертации и публикаций по теме диссертации» (в соответствии с новым СТБ «Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу. Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требование и правила составления») | 1–4 кварталы | Национальная библиотека Беларуси; ОО «ББА» (Комитет по библиографической работе, Нестеренок Н.В.) | 2023 г. |

## 3. Организационная деятельность

| № п/п | Содержание работы | Ответственные | Сроки выполнения |
|---|---|---|---|
| 1 | Проведение заседаний Совета ОО «ББА» | Председатель Совета ОО «ББА» | Ежеквартально |
| 2 | Проведение заседаний комитетов | Председатели комитетов ОО «ББА» | Ежеквартально |
| 3 | Предоставление информации для размещения на сайте ОО «ББА» по основным направлениям деятельности комитетов и Совета | Председатели комитетов ОО «ББА»; информационная служба ОО «ББА» | На протяжении года |
| 4 | Продвижение группы ОО «ББА» в социальной сети Facebook | Информационная служба ОО «ББА» | На протяжении года |
| 5 | Обновление сайта ОО «ББА» | Кулаженко В.Г., Милюнец А.Ч. | На протяжении года |

Галіна Сцяпанава



# БІБЛІЯТЭКІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ: РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АДМЕТНАСЦІ І ЦІКАВОСТКІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ

**Загадчык аддзела Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага**

Кожны рэгіён Рэспублікі Беларусь мае свае асаблівасці, у тым ліку і Гродзенскі. У вобласці склаліся шматвяковыя традыцыі добрасуседства, сяброўства, узаемадапамогі, павагі паміж людзьмі розных нацыянальнасцей, падтрымцы і развіццю якіх спрыяе разнастайная работа публічных бібліятэк. Бібліятэчныя ўстановы на аснове лепшых традыцый укараняюць новыя формы работы, аптымальна выкарыстоўваюць свой патэнцыял. З простай культурнай установы, арыентаванай на збор, захаванне і папулярызацыю перш за ўсё друкаваных дакументаў, яны ператварыліся ў шматфункцыянальныя інфармацыйныя комплексы. Бібліятэкі даўно ўжо адышлі ад звыклых канонаў, аднак традыцыйныя функцыі не зніклі, яны праяўляюць сябе інакш – у сінтэзе з новымі формамі культурнай творчасці і дасягненнямі інфармацыйных тэхналогій, выкарыстанне якіх дазваляе найбольш эфектыўна працаваць з карыстальнікамі, ствараць камфортнае бібліятэчнае асяроддзе, спрыяе раскрыццю ўнікальнасці рэгіёна.

У сваёй дзейнасці публічныя бібліятэкі Прынёмання выкарыстоўваюць мясцовыя адметнасці і цікавосткі. У першую чаргу гэта тычыцца папулярызацыі турыстычнага патэнцыялу рэгіёна.

У гэтым напрамку цікавы вопыт у Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага. Для гараджан і гасцей горада калектыў установы прапануе своеасаблівыя «Вандроўкі па горадзе з бібліятэкай» – правядзенне пешых аглядных лекцый па гістарычнай частцы абласнога цэнтра. Сярод тэматычных экскурсій – «Старонкі гісторыі Гродна» – знаёмства з цікавымі фактамі развіцця горада над Нёманам, «Літаратурнымі сцежкамі Гародні» – экскурс па жыцці і творчасці пісьменнікаў, звязаных з Прынёманскім краем, «Ад класікі да крафта: гісторыя броварства на Гродзеншчыне», «Жамчужыны, упаўшыя з нябёсаў» – аповед пра шматканфесійнае жыццё гарадзенцаў.

Краязнаўства развіваецца і на раённым узроўні. Бібліятэчнымі ўстановамі распрацаваны турыстычныя маршруты па горадзе і раёне. Экскурсійная праграма «Спадчына зямлі Адэльскай» (Гродзенскі раён) прадстаўляе цікавы аповед пра святога Антонія, апекуна мястэчка; нагадвае моманты з гісторыі мясцовага касцёла Узнясення Найсвяцейшай Панны Марыі; расказвае пра Рынкавую плошчу і гандаль, які ладзіўся ў XVI–XX стст. Запамінальным будзе і наведванне музея, створанага Мар'янам Антонавічам Скрамблевічам, народным майстрам Рэспублікі Беларусь, музыкай, рэстаўратарам, які ствараe ўнікальныя народныя інструменты, здаўна вядомыя ў Беларусі: дудачкі, флейты, жалейкі, акарыны ў выглядзе птушак і рыб, паляўнічыя рогі і трэмбіты з розных парод дрэў: клёну, акацыі, ясеня, чаромхі, хвоі, дубу, рабіны, чорнага бэзу і нават індыйскага бамбуку.

Падчас экскурсіі «Гістарычнымі мясцінамі пасёлка Любча» (Навагрудскі раён) прапануецца наведаць тэрыторыю Любчанскага замка, памятны знак, які быў адкрыты да 405-годдзя Любчанскай друкарні, прагуляцца па мясцовым парку і пазнаёміцца з гэтым помнікам садова-паркавага мастацтва, які быў створаны ў XVIII ст.

Гарадскімі бібліятэкамі г. Гродна паспяхова рэалізуецца экскурсійны краязнаўчы праект «Гістарычныя падзеі ў мемарыяльных дошках Гродна». Спецыялісты ўстаноў знаёмяць карыстальнікаў бібліятэк з аб'ектамі манументальнай скульптуры ў Гродне, расказваюць пра лёсы людзей і падзеі, якія ўвекавечаны ў мемарыяльных дошках і памятных знаках. Бібліятэкарамі падрыхтаваны 8 інклюзіўных гістарычных вандровак,

10 краязнаўчых экскурсій для дзяцей, падлеткаў і моладзі.

Прапановамі для турыстычнай галіны вылучаецца Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі, дзе дзейнічаюць 8 экскурсійных маршрутаў па выдатных мясцінах раёна і 6 – па вобласці. Акцэнт у рабоце зроблены на навучэнцаў адукацыйных устаноў.

Турыстычнай прывабнасці рэгіёна спрыяюць міні-музеі і музейныя куткі пры бібліятэчных установах, што прывяло да пашырэння сферы дзейнасці бібліятэк. Адна з прычын узнікнення музеяў – актывізацыя краязнаўчай дзейнасці. Як паказвае практыка, кожная бібліятэка дзесяцігоддзямі назапашвае матэрыялы па гісторыі сваёй малой радзімы, афармляе альбомы, прысвечаныя знакамітым землякам, вядзе летапісы вёсак і збірае прадметы матэрыяльнай культуры. Акрамя таго, бібліятэкі хочуць мець сваё аблічча, сваю індывідуальнасць. Таму стварэнне міні-музеяў ці музейных куткоў прэстыжна і станоўча ўплывае на імідж установы, спрыяе яе аўтарытэту як у дадзеным населеным пункце, так і ў маштабе раёна і вобласці.

Пры публічных бібліятэках Прынёмання створана і працуе 13 музейных пакояў і экспазіцый. Вялікім попытам карыстаюцца 3 экспазіцыі музейнага пакоя «Лялечны дом», што працуе ў 3-м філіяле г. Гродна. У экспазіцыі «Народная лялька» прадстаўлены беларускія лялькі, лялькі-абярэгі, гліняныя цацкі, дамавікі; «Скарбы калекцыянераў» – лялькі з прыватных калекцый, алавяныя салдацікі з часопісаў пра напалеонаўскія войскі; «Дзіўны свет лялек» складаецца з работ майстроў і ўдзельнікаў клуба «Гарадзенская лялька», якія дзейнічае пры ўстанове. Цікавая наведвальнікам і кампазіцыя «Безумное чаепитие» паводле казкі Льюіса Кэрала «Алиса в стране чудес». Калекцыя лялек унікальная: разнастайнасць стыляў, мастацкіх вобразаў і тэхнік выканання ўражваюць і робяць экспазіцыю незабыўнай.

Трэба зрабіць акцэнт і на дзейнасці музейнага пакоя «Мастацтва гліны і агню» Поразаўскай гарпасялковай бібліятэкі Свіслацкага раёна. Тут знаёмяць наведвальнікаў з багатым інфармацыйна-ілюстраваным матэрыялам пра гісторыю ўзнікнення і развіцця ганчарнага рамяства ў Поразаўскім краі, адным з цэнтраў ганчарнага промыслу Беларусі канца XIX – пачатку XX ст., унікальнай тэхналогіяй вырабу Поразаўскай чорназадымленай (чорнаглянцавай) керамікі, якая вызначалася высокім мастацкім узроўнем. У



Рэтра падарожжа з гараджанкай

экспазіцыі музея прадстаўлены дакументы і фотаматэрыялы з прыватных сямейных архіваў, запісы ўспамінаў пра мясцовых ганчароў. Выставачныя прадметы знаёмяць з рознымі прыстасаваннямі для вырабу рэчаў: ганчарным колам, горанам для абпалу (макет), драцянікам, грамушкай і прадметамі для захоўвання і транспарціроўкі прадуктаў харчавання. Сярод экспанатаў музейнага пакоя – вырабы чорназадымленай керамікі з прыватных калекцый: збаны, міскі, глячкі, гаршкі, кубкі, мялка, сляпнік, ладыш, бабачнік для выпякання, сярэднік.

У сучасных умовах менавіта незвычайныя ідэі дапамагаюць прыцягнуць наведвальнікаў у бібліятэчныя ўстановы вобласці. У гэтым кірунку вылучаецца Навагрудская раённая бібліятэка. На яе базе працуе музейная экспазіцыя макетаў архітэктурных помнікаў «Страчаная спадчына». Экспазіцыя міні-музея складаецца з макетаў партызанскай зямлянкі, палацава-паркавага комплексу, уласнасці Храптовічаў у в. Шчорсы, чыгуначнага вузла «Навагрудак» са стылізаванай мапай, Рынкавай (галоўнай) плошчы Навагрудскага ваяводства (1921–1939). Падчас знаёмства з імі госці бібліятэкі атрымліваюць новыя веды пра Навагрудак 20–30 гг. XX ст. Прасочваецца лёс асобных архітэктурных аб’ектаў, расказваецца пра цікавыя дэталі з жыцця даваеннага Навагрудка. На сучасны момант міні-музей стаў у адзін шэраг з



Экскурсія «Гісторыя Бераставіцкага краю ў фотаздымках»

галоўнымі славутасцямі горада і знаходзіцца ў пастаянным развіцці, штогод у лік яго экспанатаў дадаюцца новыя аб'екты.

Спецыялісты бібліятэчнай установы арганізавалі «Рэтра-фотаатэлье», на рэалізацыю якога атрыманы грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [1, с. 9]. Тут створана адмысловая экспазіцыя пачатку ХХ ст., набыты мэбля і аксесуары, абсталяванне для імгненных фотаздымкаў, пашыты касцюм гараджанкі і форма гімназісткі. Гэта ўсё дазваляе прымяраць на сябе вобразы навагрудчан таго часу. Інтэрактыўная праграма «Падарожжа з навагрудскай гараджанкай» прапануе мясцовым жыхарам і турыстам прадоўжыць незвычайнае падарожжа па горадзе з элементамі гульні.

Папулярызацыі асаблівасцей раёнаў садзейнічае і распрацоўка публічнымі бібліятэкамі Гродзенскага рэгіёна сувенірнай прадукцыі: календары, паштоўкі, магніты і іншыя матэрыялы рэкламуюць гісторыка-культурную спадчыну Прынёманскага краю. Станоўчы вопыт у гэтым кірунку маюць абласная бібліятэка, раённыя бібліятэкі Карэліцкага, Мастоўскага, Шчучынскага раёнаў, бібліятэчныя ўстановы Гродзенскага раёна і інш.

Цікавы вопыт бібліятэк назіраецца і ў арганізацыі вольнага часу аднавяскоўцаў. Неардынарна падыходзіць да гэтай справы бібліятэкар Кальчунскай сельскай бібліятэкі Ашмянскага раёна. Супрацоўнік установы стварыла сістэму, якая ўдала спалучыла функцыі «Школы здароўя» з традыцыйнымі формамі бібліятэчнай работы. Фізкультурныя заняткі і рухомыя гульні ў комплексе з індывідуальнымі і групавымі гутаркамі, віктарынамі, конкурсамі прыйшліся даспадобы як дарослым, так і дзецям. З'явіўся тут і куток бібліятэрапіі – своеасаблівая зона псіхалагічнай разгрузкі: у ціхай, утульнай абстаноўцы можна расслабіцца: пасядзець у мяккім крэсле з кнігай у руках, паглядзець альбомы рэпрадукцый карцін вядомых мастакоў, дзіцячых малюнкаў, паслухаць аўдыязапісы спеваў птушак. Адчуць паўнату разумення свайго ўнутранага стану дапамагаюць антыстрэсавыя мандалы-размалёўкі. Ва ўстанове дзейнічае валанцёрская група, якая арганізавана ў працэсе рэалізацыі бібліятэчнай праграмы «Твары дабро разам з намі». Валанцёры дапамагаюць абслугоўваць пажылых людзей і чытачоў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, чытаюць услых творы для юных наведвальнікаў, праводзяць заняткі ў «Школе камп'ютарнай граматнасці» для жыхароў старэйшага ўзросту.

У Міхалішкаўскай сельскай бібліятэцы Астравецкага раёна арганізаваны валанцёрскі рух «Кніга ідзе да вас!». Бібліятэкар сумесна з актывам наведвае бальніцу сястрынскага догляду і людзей пажылога ўзросту, якія не могуць самі прыйсці ва ўстанову. Падчас такіх сустрэч праходзяць абмеркаванні навін «Добры настрой», «Як захаваць здароўе», «Кніга на службе здароўя», аказваецца сацыяльная дапамога ў паўсядзённым жыцці. Актывісты дастаўляюць літаратуру, чытаюць услых перыядычныя выданні, прыносяць ваду ці дровы ў хату.

Усімі бібліятэчнымі ўстановамі Гродзенскай вобласці наладжана цеснае супрацоўніцтва з арганізацыямі дашкольнай, агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай адукацыі па папулярызацыі кнігі і чытання сярод дзяцей і моладзі. Сярод папулярных актыўнасцей – адукацыйныя праекты «Кніжны дэсант» (Гродзенская абласная навуковая бібліятэка

імя Я.Ф. Карскага), «Кніга збірае сяброў» (Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы), штомесячная PR-акцыя «Да вас у госці кніга ідзе» (Ашмянская раённая бібліятэка) і іншыя сацыякультурныя мерапрыемствы.

Бібліятэчныя ўстановы ў 2022 г. рэалізавалі новыя праекты сумесна з абласной бібліятэкай і раённымі сродкамі масавай інфармацыі: «PROчитал», «Новинки литературы», «Книжный Istopper», «Новинки с книжной полки», «Книга в моей жизни» (Ашмянская, Бераставіцкая, Карэліцкая, Ваўкавыская, Свіслацкая, Слонімская раённыя ўстановы адпаведна) і інш.

«Библиотека идет к вам» – такі праект Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага ладзіць сумесна з рэдакцыяй газеты «Гродзенская праўда». Гэта агляд найбольш цікавых, адметных, папулярных выданняў, якія знаходзяцца ў фондзе абласной установы.

Навагрудская раённая бібліятэка сумесна з рэдакцыяй праграмы «Навагрудскія навіны» («НовоТВ») знаёміць гледачоў з кнігамі на беларускай мове і пра беларускую мову.

Не пакінуў абыякавым як гледачоў, так і ўдзельнікаў відэапраект «Пільнае адно толькі сэрца», які ажыццяўляюць у ЦБС г. Гродна сумесна з тэлеканалам «Гродна плюс». Дзеці з парушэннямі зроку чыталі творы разам з тэле- і радыёвядучымі. У яго межах падрыхтавана 8 захапляльных відэасюжэтаў.

Праца бібліятэчнай супольнасці Прынёмання знайшла сваё адлюстраванне ў агульнаабласных анлайн-праектах «Ганаруся табой, Беларусь», «Я – падарожнік, я – краязнаўца», «Топ-265 читательских предпочтений». Кожная дзяржаўная ўстанова культуры бібліятэчнага тыпу прадстаўляла відэаролікі адпаведнай тэматыкі.

Хочацца адзначыць і абласны чэлендж «Класічна… патрыятычна: Гродзеншчына чытае Янку Купалу і Якуба Коласа», прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння знакамітых песняроў краіны. Падчас яго правядзення людзі розных узроставых катэгорый чыталі творы паэтаў. На ўласных сайтах бібліятэчных устаноў вобласці, сацыяльных сетках і тэлеграм-канале «Культура Гродзеншчыны» былі размешчаны амаль 1000 фотаздымкаў.

Сёння на старонках прафесійнага часопіса хочацца ўзгадаць і пра абласныя конкурсы, накіраваныя на раскрыццё творчых здольнасцей як бібліятэкараў, так і жыхароў Гродзеншчыны і адметныя для кожнага рэгіёна.

Першы такі конкурс «На лепшую самаробную кнігу» быў аб'яўлены ў 2015 г. Ён прымяркоўваўся да рэспубліканскага свята – Дня беларускага пісьменства – 2015 у Шчучыне. Да ўдзелу ў конкурсе было пададзена 59 творчых работ, аўтарамі 7 з іх з'яўляліся дзеці. Менавіта працы гэтага конкурсу пакладзены ў аснову стварэння электроннага інфармацыйнага рэсурсу «Самаробная кніга».

Аднайменны конкурс у другі раз прысвяцілі 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Як падкрэслілі члены журы, ён адрозніваўся ад мінулага выдатнай якасцю выканання і актыўным удзелам супрацоўнікаў публічных бібліятэк і ўстаноў адукацыі, навучэнцаў агульнаадукацыйных школ Гродзенскай вобласці.

У 2022 г. вырашылі выкарыстаць папярэдні вопыт і прапанавалі конкурс самаробнай лялькі «Вернісаж літаратурных герояў» (раней ладзіўся конкурс «Героі кніжных старонак»). Удзельнічалі ў ім звыш 140 жыхароў Прынёманскага краю (больш за 150 творчых прац па 4 намінацыях). Асобныя лялькі ці кампазіцыйныя сцэны літаратурных твораў далі магчымасць дакрануцца да старонак любімых кніг, успомніць галоўных персанажаў.

Збору, захаванню і папулярызацыі ведаў аб гісторыка-культурнай спадчыне Гродзеншчыны, знакамітых земляках і гістарычных падзеях малой радзімы садзейнічалі абласныя спаборніцтвы – конкурсы фоталетапісаў «Малая радзіма: імгненні гісторыі» і макетаў «Архітэктурныя помнікі малой радзімы».

На 2023 г. запланаваны конкурс сярод публічных бібліятэк Прынёманскага краю на лепшую віртуальную віктарыну, інтэрактыўную гульню, анлайн-крыжаванку. Хочацца верыць, што ён атрымаецца таксама ўдала, будзе змястоўным і не менш цікавым, чым у папярэднія гады.

Спадзяёмся, што штодзённая, крэатыўная работа, творчы і неардынарны падыход да справы дапамагаюць публічным бібліятэкам Гродзенскага рэгіёна заставацца запатрабаванымі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Царук, І.** Рэтра-фотаатэльє ў бібліятэцы / Ірына Царук // Бібліятэчны свет. – 2021. – № 4. – С. 3–9.

Summary

The article presents the creative experience of public libraries in the Grodno region.

Юрий Рачинский



# ВОСТРЕБОВАННЫЕ ФОРМЫ РАБОТЫ БИБЛИОТЕК ГОМЕЛЬСКОЙ ОБЛАСТИ С ДЕТЬМИ И ПОДРОСТКАМИ

Библиотекарь
Гомельской областной
универсальной библиотеки
им. В.И. Ленина

Главная задача библиотеки в работе с подрастающим поколением – посредством книги и чтения содействовать формированию гармонично развитой, образованной, социально активной личности, свободно ориентирующейся в информационном пространстве. Это сложный и долговременный процесс, требующий целенаправленной работы. Эффективность любого мероприятия, направленного на решение этой задачи, в большой степени зависит от неординарного решения организатора. Качественный креатив будет прекрасно работать в любом формате – будь то литературно-музыкальная гостиная, викторина или полномасштабная акция.

Проанализировав опыт работы библиотек Гомельской области с детьми и подростками, можно сделать вывод, что наиболее востребованными являются мероприятия, построенные на основе активного взаимодействия организаторов и участников. Не секрет, что подростковая аудитория отдает предпочтение интерактивным формам работы: интеллектуальные игры, квесты, дискуссии, викторины с использованием современных технологий. В практике работы библиотек Гомельской области они используются повсеместно. В 2022 г. в Буда-Кошелевском, Житковичском, Чечерском районах были проведены квесты «Литературный экспресс», «К живым огням родного очага», «Охота на книгу», «С книгой по улицам города». В Добрушской и Ельской центральных районных библиотеках прошли циклы интеллектуальных игр «Битва читающих» и «Персона Incognito».

Востребованы и интерактивные программы, в ходе которых участникам предлагаются различные виды активностей: от знакомства с художественными произведениями и участия в реконструкции народных обрядов до оформления страниц известных исторических личностей в социальных сетях и использования QR-кодов для выполнения заданий. Данная форма работы наиболее часто применяется при организации летних библиотечных площадок на свежем воздухе и включает в себя викторины, интеллектуальные задания, подвижные игры «В гостях у Алладина» (Ельская сеть библиотек), «Читаем, учимся, играем» (Калинковичская сеть библиотек).

В библиотеках Калинковичского района с успехом проходят мероприятия, в основе которых лежат идеи телевизионных проектов: брейн-ринг «Наш общий дом – природа» и поле чудес «В мире привычных вещей».

Неизменно вызывают интерес у детей и подростков конкурсы «Лучший читатель детских книг» (Гомельская городская сеть библиотек), «Лидер Летних чтений», «Самый активный читатель» (Брагинская сеть библиотек), «Лучший читатель лета» (Петриковская сеть библиотек); летние программы чтения «Великий книжный путь» (Гомельская городская сеть библиотек) и др. В период летних каникул в библиотеках Светлогорского района востребован проект «Библиотека и школа: партнеры в области образования», направленный на привлечение детей и подростков к книге и чтению. В 2022 г. участниками летних клубов чтения стали более 2,2 тыс. детей и подростков. Лучшие читатели по итогам работы проекта получают сертификаты, которые позволяют им в первой четверти учебного года повысить оценку на балл по русской или белорусской литературе.

Библиотеками уделяется особое внимание вопросам безопасности несовершеннолетних в различных сферах: здоровый образ жизни, финансовая и правовая грамотность, межличностные взаимоотношения. Обсуждение важных для детей и подростков вопросов в интерактивной и диалоговой форме неизменно вызывают положительные отклики. Так, в 2022 г. в городской библиотеке № 4 г. Светлогорска прошел психологический медиаурок «Контакты и конфликты» для подростков из клуба «Лидер». В ходе мероприятия библиотекари с детьми обсудили варианты конфликтных ситуаций в подростковой среде и способы их предотвращения. В рамках мероприятий ко Дню матери в библиотеке-филиале № 14 г. Гомеля была затронута проблема взаимоотношений детей и родителей как фактора психологического благополучия. Ролевые игры, предложенные психологом центра социального обслуживания населения Новобелицкого района г. Гомеля, помогли подросткам взглянуть с разных сторон на общение и создание доверительных взаимоотношений с родителями. Проблеме поведения в Интернете были посвящены занятия «Виртуальный мир», «Друг реальный или виртуальный: как не ошибиться в выборе друзей?» (Гомельская городская сеть библиотек).

В целом диалоговые формы работы дают возможность подросткам выражать и отстаивать свое мнение по различным вопросам, рассуждать, слушать, то есть способствуют развитию межличностной коммуникации. Наглядным примером такого рода мероприятий выступает литературный суд. В рамках этой формы работы создается имитация судебного заседания, где предметом обсуждения служат литературное произведение либо его персонажи. Так, в Гомельской центральной районной библиотеке с успехом прошло «судебное заседание», в котором в качестве подсудимой предстала Снежная Королева из одноименной сказки Ханса Кристиана Андерсена, а дети выступали в качестве защитников и обвинителей персонажа.

Творческий подход к профориентационной работе также дает свои положительные результаты. Детская библиотека-филиал № 16 г. Гомеля предложила своим читателям превратиться в организаторов мероприятия. Результатом эксперимента стала праздничная программа ко Дню матери. Дублер-шоу «Библиотекарь на час» позволило юным читателям Рогачевской городской библиотеки № 3 побыть в роли библиотекаря и обслужить пользователей, осваивая при этом правила приема, выдачи и расстановки книг. В детской библиотеке увлекательно проходят встречи с врачами, пожарными и участковыми инспекторами, специалистами других сфер. На таких мероприятиях дети задают вопросы и знакомятся с профессиями в игровой форме. Данная практика распространена во всех библиотечных сетях Гомельской области.

Повысить качество чтения и организации досуга можно и за счет объединения гуманитарных и онлайн-технологий. Такой синтез помогает заинтересовать подростков, делает чтение и досуг увлекательным. Опираясь на литературный материал, библиотеки используют сетевые коммуникации и интернет-сервисы. Среди них – проекты «Творчество души», «Литературная мастерилка», «А вы знаете, что?..», «Всё обо всём», «Алесіны казкі» (Гомельская городская сеть библиотек), которые знакомят ребят с литературой, музыкой, природными явлениями. Детям предлагаются мастер-классы, обзоры литературы, громкие чтения и викторины.

В 2022 г. в Мозырской городской библиотеке № 7 прошел фотоарт «Я и книга в объективе». Самыми активными участниками стали читатели-подростки. Они выбирали локации для фотосъемки, придумывали сюжеты для рекламы, отбирали для презентации любимые книги и размещали фотографии в социальной сети ВКонтакте.

Все чаще появляются и внедряются в практику библиотечной работы новые форматы, которые прививают подросткам любовь к чтению, развивают творческие способности ребят. Возрастает количество «живых» форм работы, позволяющих посетителям принимать активное участие в мероприятиях или включаться в диалог. Таким образом, библиотека для современного подростка становится не только пунктом выдачи книг, но и площадкой для саморазвития и дополнительного образования.

Summary

The article presents modern forms of work with children and adolescents in the conditions of public libraries in the Gomel region.

**Юлія Касцюк**



**Вучоны сакратар Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна**





# Памятаць, берагчы, аднаўляць: да 140-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа

Класікі беларускай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас – сапраўдныя летапісцы народнага жыцця, выразнікі думак і спадзяванняў народа. Дзякуючы свайму таленту, яны здолелі на поўны голас сказаць сваім сучаснікам і нашчадкам, а таксама народам іншых краін свету праўдзівае слова пра Беларусь, пра яе мінулае, пра нацыянальны характар беларуса. І ў гэтым іх вялікая гістарычная заслуга.

Сёння, як і раней, творы паэтаў карыстаюцца шырокай папулярнасцю. Яны прываблiваюць чытачоў глыбінёй думкі, праўдзівым адлюстраваннем жыцця, шчырасцю выяўлення пачуццяў любові да чалавека, да «роднага кута», да Радзімы. Яшчэ са школы нашымі добрымі спадарожнікамі сталі купалаўскі гусляр Міхал з «Новай зямлі» і настаўнік Лабановіч з твораў Якуба Коласа. Песняры Беларусі валодалі здольнасцю глядзець далёка наперад, бачыць заўтрашні дзень краіны. Вось чаму новыя чытацкія пакаленні ў творах Янкі Купалы і Якуба Коласа знаходзяць адказы на пытанні, якія іх зараз хвалююць.

Жыццёвыя сцежкі Янкі Купалы і Якуба Коласа ў свой час неаднаразова пралягалі праз Прыдняпроўе. Тут размешчаны шмат куткоў, звязаных з імёнамі нацыянальных паэтаў. Яны хоць і не такія славутыя, і не так цесна звязаны з жыццём класікаў, але ж адзначаныя іх наведваннем і таму важныя, цікавыя і дарагія для магіляўчан.

Магілёўская зямля захоўвае памяць аб знаходжанні песняроў на ёй як каштоўны духоўны набытак, ганарыцца прабываннем вялікіх галасоў краіны ў сваіх гарадах і вёсках. Да кожнай юбілейнай гадавіны Янкі Купалы і Якуба Коласа Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна рыхтуе шэраг цікавых мерапрыемстваў і электронных інфармацыйных рэсурсаў у іх гонар, шануе памяць нацыянальных класікаў, папулярызуе веды аб іх жыцці і творчасці сярод сваіх карыстальнікаў. У 2012 г. да 130-годдзя пісьменнікаў складзены бібліяграфічны паказальнік «Творы Янкі Купалы і Якуба Коласа ў беларускай музыцы». Лірычная паэзія песняроў трывала ўвайшла ў творчасць беларускіх кампазітараў, з ёю цесна звязаны зараджэнне і развіццё розных жанраў беларускай музыкі. Кожны, хто хоць раз дакранаўся да твораў песняроў, адчуў уздзеянне прыгажосці іх непаўторнага своеасаблівага верша, адчуў яго напеўнасць, насычанасць, незвычайную музычнасць.

У 2012 г. з мэтай адлюстравання сувязі народных класікаў з літаратурным жыццём вобласці аддаленым карыстальнікам была прапанавана віртуальная выстава «Янка Купала і Якуб Колас у творчасці пісьменнікаў Магілёўшчыны», якая знаёміла з вершамі, прысвечанымі беларускім класікам, і артыкуламі магілёўскіх літаратуразнаўцаў аб іх творчасці.

У 2017 г. да 135-годдзя нацыянальных дзеячаў культуры створаны бібліяграфічны паказальнік «Янка Купала, Якуб Колас і Магілёўшчына». Выданне адлюстроўвае сувязі народных пісьменнікаў з культурным і літаратурным жыццём магілёўскага краю, сістэматызуе звесткі пра памятныя купалаўскія і коласаўскія мясціны і ўключае 927 дакументаў за 1921–2017 гг. на беларускай і рускай мовах.

У вераснёўскія Дні адчыненых дзвярэй 2017 г. у фае бібліятэкі дзейнічала агучаная выстава-інсталяцыя «З Купалам і Коласам у сэрцы жывём». Наведвальнікам дэманстраваліся відэаролікі і песні на вершы паэтаў, гучалі творы класікаў у выкананні саміх аўтараў і прафесійных артыстаў. Не засталася па-за ўвагай інсталяцыя працоўнага стала пісьменнікаў «З класікамі ў аб'ектыве», дзе кожны жадаючы паспрабаваў пісаць пёравай ручкай, пагартаў прыжыццёвыя зборнікі Янкі Купалы і Якуба Коласа, зрабіў сэлфі ў рэтра-стылі.

Вельмі папулярнымі рэсурсамі сярод аддаленых карыстальнікаў да гэтага часу з'яўляюцца інтэрактыўныя віктарыны «Мне сняцца сны аб Беларусі…» (Якуб Колас) і «Сэрца пакідаю вам…» (Янка Купала), размешчаныя на сайце ўстановы да 135-годдзя класікаў. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы знаёмяць карыстальнікаў з малавядомымі фактамі жыцця нацыянальных класікаў і гісторыяй стварэння іх сусветна вядомых твораў.

У лістападзе таго ж 2017 г. у Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна адбылася сустрэча чытачоў з унучкамі Якуба Коласа – Марыяй Міхайлаўнай і Верай Данілаўнай Міцкевіч. Абедзве жанчыны займаюцца даследаваннем дзейнасці свайго дзеда, адкрываючы невядомыя да гэтага часу старонкі яго жыцця. Шмат часу праводзяць у архівах Беларусі і замежжа, наведваюць мясціны, дзе ў розныя гады жыў Якуб Колас, сустракаюцца з людзьмі, якія былі знаёмы з ім, запісваюць іх успаміны.

Належную даніну ўдзячнай памяці і павагі слынным песнярам Беларусі Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна аддала і ў Год гістарычнай памяці. Святкаванне 140-й гадавіны іх нараджэння прайшло вельмі насычана і змястоўна. Увагу чытачоў да творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа на працягу 2022 г. прыцягваў шэраг змястоўных выстаў, кожная з якіх па-свойму адлюстроўвала спадчыну славутых мастакоў беларускага слова.

На абанеменце дзейнічаў адкрыты прагляд літаратуры «Вобразы мілыя роднага краю», які знаёміў з літаратурнай спадчынай паэтаў. Ужо больш за стагоддзе людзі захапляюцца чысцінёй, мілагучнасцю і непаўторнасцю паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Кожны іх твор – гэта споведзь, дзённік, па якім можна ўзнавіць увесь жыццёвы шлях аўтара і дзе ўсё засведчана асабіста перажытымі хваляваннямі. Здаецца, і ведаеш творы класікаў, а ўсё роўна кожны раз, калі разгортваеш іх кнігі і пачынаеш чытаць – адкрываеш для сябе штосьці новае, нязведанае.

Аддзел краязнаўства падрыхтаваў для сваіх чытачоў кніжныя выставы «Пясняр зямлі беларускай» і «Волат беларускай паэзіі», матэрыялы якіх знаёмілі з малавядомымі старонкамі жыццёвых лёсаў і творчых біяграфій Янкі Купалы і Якуба Коласа адпаведна, а таксама з іх творамі-юбілярамі 2022 г.

Не дзіўна, што творчасць самабытных мастакоў слова стала крыніцай натхнення для многіх беларускіх рэжысёраў, кампазітараў, жывапісцаў і графікаў. Яркае таму пасведчанне – выстава «140 гадоў з дня нараджэння Якуба Коласа і Янкі Купалы», якая дзейнічала ў музычнай гасцёўні Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна. Акрамя выбітных твораў-шэдэўраў нацыянальнай літаратуры выстава прапанавала шматлікія ілюстрацыі да іх, створаныя знакамітымі майстрамі: народным мастаком БССР і СССР, Героем Беларусі, кавалерам ордэна Ф. Скарыны Міхаілам Андрэевічам Савіцкім і народным мастаком БССР, заслужаным дзеячам мастацтваў БССР Васілём Пятровічам Шаранговічам.

Міхаіл Савіцкі, якому ў 2022 г. споўнілася б сто гадоў з дня нараджэння, па ініцыятыве Дзяржаўнага літаратурнага музея імя Янкі Купалы, стварыў свой «Купалаўскі цыкл» напярэдадні стогадовага юбілею песняра. На выставе прадстаўлены копіі карцін мастака з гэтага цыкла: «Жніво», «Калыханка», «Калгасніца», «На сенажаці», у якіх М. Савіцкі дакладна перадаў быт простых беларускіх людзей, а таксама манументальна-эпічны партрэт Янкі Купалы, які лічыцца самым значным у сучасным беларускім жывапісе.

Васіль Шаранговіч (1939–2021) у сваёй творчасці не аднойчы звяртаўся да спадчыны Янкі Купалы і Якуба Коласа. Да юбілейнага выдання паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа, выдадзенага ў 2002 г., мастак за паўтара года выканаў у тэхніцы акварэлі больш за 90 ілюстрацый. У гэтым яму дапамаглі ўспаміны дзяцінства, веданне рэалій і асаблівасцей традыцыйнага вясковага жыцця. Ілюстрацыі вылучаюцца разуменнем коласаўскай мовы, пашанай да герояў і любоўю да роднага краю.

Не абыйшлося і без юбілейных мерапрыемстваў. Менавіта ў дзень нараджэння

Янкі Купалы, 7 ліпеня 2022 г., адбылася паэтычная гадзіна «Несмяротная душа Беларусі», а 3 лістапада 2022 г., у дзень нараджэння Якуба Коласа, – літаратурная гадзіна «Не змоўкне голас песняра».

Класікаў нярэдка шануюць, не ўдаючыся ў дэталі: здаецца, са школы ўсё ўжо вядома. І ўсё ж, зноў кажучы пра Янку Купалу ці Якуба Коласа, кожны з нас даведаецца нешта новае. Менавіта таму Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна адкрыла юбілейны 2022 г. Тыднем «З Купалам у сэрцы» ў віртуальнай прасторы, а годным яго працягам стаў Тыдзень «З Коласам у сэрцы». На працягу сямі ліпеньскіх і сямі лістападаўскіх дзён напярэдадні юбілеяў нацыянальных паэтаў аддаленыя карыстальнікі знаёміліся на сайце ўстановы з малавядомымі фактамі з іх жыцця і іх паэзіяй – паэзіяй пачуццяў, эмоцый, глыбокіх разважанняў і перажыванняў. Сем дзён – сем цікавых фактаў і сем паэтычных шэдэўраў… Але нават гэтая невялікая частка літаратурнай спадчыны Янкі Купалы і Якуба Коласа з'яўляецца яркім пацвярджэннем таго, як творчасць песняроў, ад першага да апошняга верша належыць Беларусі і яе нацыянальнай культуры, уяўляе сабой сапраўдную энцыклапедыю жыцця беларускага народа.

Абодва народныя паэты надавалі вялікую ўвагу развіццю дзіцячай літаратуры. Аб гэтым сведчаць іх шматлікія творы для дзяцей і, безумоўна, «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа, якое стала важным этапам на шляху станаўлення ўсёй беларускай дзіцячай літаратуры. Як выдатны педагог аўтар падручніка разумеў, што пачынаць выхаванне свядомасці асобы неабходна з дзіцячага ўзросту.

З майстэрствам класікаў як дзіцячых пісьменнікаў самых маленькіх чытачоў бібліятэкі пазнаёміў цыкл відэачытанняў павучальна-пазнавальных твораў «Бай» Янкі Купалы і «Два зайцы» Якуба Коласа, падрыхтаваных супрацоўнікамі дзіцячага аддзела. Юнацкі аддзел прапанаваў падлеткам сабраць пазлы ў анлайн-ігратэцы і прачытаць на іх вершы вялікіх паэтаў.

З мэтай папулярызацыі творчай спадчыны класікаў беларускай літаратуры, павышэння творчай актыўнасці і выканальніцкага майстэрства на працягу юбілейнага 2022 г. Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна праводзіла конкурс «Зямлі вялікай галасы» на лепшае чытанне твораў класікаў беларускай літаратуры сярод людзей з інваліднасцю па зроку. У конкурсе прынялі ўдзел людзі рознага ўзросту не толькі з Беларусі, але і з Расіі.

Маладзёжнай інтэрнэт-аўдыторыі юнацкі аддзел прапанаваў прыняць удзел у сеткавай акцыі «Душа і голас зямлі беларускай». Для гэтага неабходна было размясціць на асабістай старонцы ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» пост, які змяшчаў бы верш або ўрывак з празаічнага твора Янкі Купалы ці Якуба Коласа.

У калектыве Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна склалася добрая традыцыя знаёміцца з цікавымі мясцінамі Беларусі. Звычайна паездкі прымяркоўваюцца да найбольш памятных і знамянальных дат. 140-годдзе з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы – лепшая нагода наведаць мясціны, звязаныя з імем класіка беларускай літаратуры. Недалёка ад Магілёва, усяго ў 60 км, у в. Ляўкі Аршанскага раёна знаходзіцца філіял дзяржаўнага літаратурнага музея імя Янкі Купалы. Менавіта туды ў жніўні 2022 г., на летнік пісьменніка, пралажылі свой маршрут супрацоўнікі бібліятэкі разам з дзецьмі і ўнукамі ў апошнія дні летніх канікул.

Аддаленасць ад гарадоў, адхіленасць ад паўсядзённай мітусні давалі магчымасць Янку Купалу адпачываць тут душой і ствараць літаратурныя шэдэўры. У любую пару тут пануе цішыня і спакой, якія парушаюцца толькі шумам лесу і плёскатам дняпроўскіх вод. Ляўкі натхнялі паэта, сталі для яго тым, чым было Міхайлаўскае для А.С. Пушкіна, Меліхава для А.П Чэхава, Дуніна для М.М. Прышвіна. Толькі тут можна зразумець, чым Ляўкі так прывабілі Янку Купалу, і чаму тут неабходна пабываць усім, хто цікавіцца асобай пісьменніка і вывучае развіццё айчыннай літаратуры.

Спадзяёмся, што тая вялікая праца па ўшанаванні памяці беларускіх волатаў мастацкага слова, якую праводзіць Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, зацікавіць не толькі прыхільнікаў паэзіі, але і кожнага наведвальніка прымусіць яшчэ раз учытацца ў неўмiручыя купалаўскія і коласаўскія радкі.

Summary

The article analyzes the experience of honoring the memory and popularizing the work of Yanka Kupala and Yakub Kolas in the conditions of the Mogilev Regional Library named after V.I. Lenin.

Елена Знарок



# ДНЕВНИК ИНТЕРЕСНЫХ КАНИКУЛ

Библиотекарь
Лепельской детской
библиотеки

Школьные каникулы – замечательный период, когда можно отдохнуть от занятий, набраться сил для учебы. Детям очень важно потратить это время с пользой.

Организация отдыха детей и подростков в дни школьных каникул является приоритетным направлением работы детской библиотеки г. Лепеля. В этой связи сотрудники библиотеки создают комфортные усло-вия пребывания детей в учреждении, обеспечивают их безопасность во время проведения мероприятий, а также расширяют кругозор ребят, обучают их искусству общения, прививают любовь к книге.

Школьные каникулы становятся для учащихся периодом полезной досуговой деятельности. На протяжении многих лет Лепельская детская библиотека ведет работу со школьными лагерями учреждений общего среднего образования № 1 и № 3 г. Лепеля, а также – с детскими дошкольными учреждениями.

При взаимодействии со школьными лагерями используются различные формы и методы работы: конкурсы, акции, игры, квесты, приключения, литературные путешествия – все это позволяет сделать досуг детей не только интересным, но и полезным. Все проводимые в этих учреждениях мероприятия входят в годовой план работы библиотеки.

Во время весенних каникул в нашей библиотеке проходила акция «Я люблю библиотеку», приуроченная к Неделе детской книги. В ней участвовали не только ребята из школьных лагерей, но и все желающие. Ребята с радостью фотографировались с плакатом «Я люблю библиотеку» и оставляли пожелания нашему учреждению.

В 2022 г. Лепельская детская библиотека совместно с районным отделом по чрезвычайным ситуациям работала по программе «МЧС спешит в библиотеку». В рамках сотрудничества проведена познавательная игра «С электричеством шутки плохи», конкурсно-игровые программы «Лето классное, безопасное» и «Каникулы без дыма и огня». Принимая участие в мероприятиях, школьники в игровой форме повторили и закрепили знания об опасностях, которые подстерегают их в быту, правила обращения с электроприборами, узнали, как вести себя при пожаре.

С целью продвижения чтения, популяризации творчества детских писателей и формирования бережного отношения к книгам был проведен ряд мероприятий. Наиболее запоминающимися из них стали литературный коктейль «Где-то в тридесятом царстве тридевятом государстве» по творчеству А.С. Пушкина, аукцион по сказкам «Большая сказочная контрольная», веселая карусель «Детям: про все на свете» по творчеству С.Я. Маршака, литературный круиз «Вредные советы для непослушных детей» по творчеству Г. Остера. В ходе этих мероприятий ребята ознакомились с жизнью и творчеством писателей, прочли их сказки, рассказы, стихи, попробовали свои силы в сказочных эстафетах, викторинах и загадках. Дети с большим интересом приняли участие в поиске сказочных предметов в рамках аукциона «Большая сказочная контрольная».

В нашей библиотеке особое внимание уделяется тематическим познавательным мероприятиям. К их подготовке библиотекари подходят ответственно и креативно, чтобы мероприятие получилось полезным, запоминающимся и необычным. Выбираются актуальные темы для детей, которые обучают культурному поведению в обществе, рассказывают о семейных ценностях, здоровом образе жизни, охране окружающего мира, заботе о природе и животных. Среди таких мероприятий можно выделить урок этикета «Этикет дает ответ», праздник традиций

«7-я и дом, и мы все в нем», экотурнир «Волшебный мир зверей и птиц», игра-путешествие «Откуда берутся грязнули?».

Ребята совершили увлекательное путешествие в «Страну вежливости» на уроке этикета «Этикет дает ответ». Они вспомнили правила вежливости, поучаствовав в игре «Вежливо – невежливо», провели соревнования на знание вежливых слов, поговорили об этикете.

В игре-путешествии «Откуда берутся грязнули?» дети путешествовали по станциям «Грязнулькино», «Город Лентяйск», «Угадайка» и конечная станция «Город Чистоты и Порядка». На каждой из них ребята выполняли различные конкурсы и задания. Например, на станции «Угадайка» в игре «Задорные улыбки» детям нужно было почистить зубы. Каждому участнику предстояло с закрытыми глазами нарисовать по одному зубу улыбающемуся человечку на картинке. Учитывались ловкость, умение и сплоченность команды.

На празднике традиций «7-я и дом, и мы все в нем» дети «строили дом» под названием «Семья», фундаментом которого являлись «Кирпич любви», «Кирпич дружбы», «Кирпич взаимопонимания», «Кирпич смеха» и «Кирпич семейных ценностей». Для того чтобы получить определенный «кирпич», детям необходимо было выполнять задания, например донести фасоль до «огорода» без рук или отгадать слово в конкурсе «Устами младенца».

В экотурнире «Волшебный мир зверей и птиц» ребята проявили свою смекалку и сообразительность в игре «Звериные тропы». Они дружно переправлялись на другой берег, перекладывая при каждом шаге бумажные следы зверей. Ребята доходили до финиша и бежали с этими следами обратно, передавая следующему игроку.

Кроме тематических познавательных мероприятий в библиотеке проходят развлекательные мероприятия, ведь на каникулах детям так и хочется побегать, поиграть и пошутить. Наши сотрудники проводят для читателей конкурсно-игровые программы «Заряди батарейки», «Простоканикулово», «Сколько у солнышка ярких лучей, столько у нас забав и затей», конкурс сладкоежек «В сладком царстве», поединок фантазеров «Лето, солнце, сто фантазий». Все эти мероприятия обычно проходят шумно и весело.

В рамках конкурсно-игровой программы «Сколько у солнышка ярких лучей, столько у нас забав и затей», девочки и мальчики временно поменялись местами. Девочки играли в футбол, а мальчики – в твистер[1]. Ребята поняли, что все-таки лучше играть вместе.



В поединке фантазеров «Лето, солнце, сто фантазий» школьникам нужно было проявить смекалку: спрятать газету в пластиковую бутылку на конкурсе «Спрячь газету».

В рамках конкурса сладкоежек «В сладком царстве» ребята вспоминали известные восточные сладости, узнавали героев сказок, которые тоже любили сладкое, а также смогли угоститься пряниками, но не обычно, а по-вьетнамски. В конце мероприятия не обошлось без вручения сладких призов всем участникам.

Таким образом, мероприятия Лепельской детской библиотеки популяризируют книгу, формируют культуру чтения, развивают воображение и творческие способности, способствуют осмысленному и продуктивному отдыху, решают проблему занятости ребят на каникулах.

Summary

The article presents the experience of organizing leisure activities for schoolchildren during the holidays in the children's library of Lepel.

[1] Твистер – подвижная напольная игра на мате с цветными кругами.

**Надзея Стахавец**



**Загадчык аддзела
Столінскай цэнтральнай
раённай бібліятэкі**

# БІБЛІЯТЭЧНЫ ГАРАДОК

Гарадок… Менавіта так у сваёй большасці называюць г. Давыд-Гарадок Столінскага раёна мясцовыя жыхары. Горад з колькасцю насельніцтва амаль у 6 тыс. жыхароў. Горад, які заўсёды лічыцца горадам чытаючым. Для сябе асабіста я называю Давыд-Гарадок горадам кветак і паэтаў. Кветак, таму што яны адразу ж кідаюцца ў вочы, яны паўсюль: перад і за агароджамі, у цэнтры горада і ля кожнай хаты кожнага завулка. А горад паэтаў, таму што давыд-гарадоцкая зямля дала шэраг літаратурных імёнаў – Георгій Марчук, Леанід Дранько-Майсюк, Уладзімір Глушакоў, Міхаіл Шэлехаў.

У віры давыд-гарадоцкага жыцця з яго адметным укладам і традыцыямі, насельніцтвам, багатай гістарычнай і літаратурнай спадчынай, сучаснымі рэаліямі маленькага палескага гарадка працуе Давыд-Гарадоцкая гарадская бібліятэка. Сама бібліятэка таксама з гісторыяй, шмат адданых бібліятэчнай справе людзей у ёй працавала, многа прайшло літаратурных незабыўных сустрэч, многія з чытачоў раз’ехаліся па іншых гарадах і нават краінах і сталі вядомымі людзьмі. Новую старонку ў сваёй гісторыі бібліятэка адкрывала ў 2017 г., калі яна атрымала іншае памяшканне і пераехала. Так, падчас абласных дажынак бібліятэка змяніла сваё месца жыхарства. Нельга не адзначыць, што для бібліятэкі гэта падзея мела як станоўчыя, так і адмоўныя бакі. Безумоўна, радасным было тое, што бібліятэка набыла сучаснае памяшканне, новую мэблю і тэхніку, але пры гэтым прыйшлося адмовіцца ад часткі фонду, таму што памяшканне аказалася невялікае па памерах. Дзеля кампактнага размяшчэння фонду для бібліятэкі былі набыты мабільныя стэлажы на рэльсах, якія эканомяць месца.

Гарадчукам пашанцавала з бібліятэкай, таму што яна сучасная і ўтульная, але не менш пашанцавала і з бібліятэкарамі – маладымі, актыўнымі, ініцыятыўнымі і старанными. На сённяшні дзень невялікі дружны калектыў узначальвае Таццяна Стахейка, а яе калегі-аднадумцы – бібліятэкары Ларыса Коўка і Ганна Немчанка. За плячыма Таццяны, Ларысы і Ганны 17, 21 і 14 гадоў бібліятэчнай працы адпаведна. Тры работнікі нясуць бібліятэчную варту годна і эфектыўна. Штогод бібліятэкай карыстаецца звыш 2 тыс. жыхароў горада, пераважная большасць (каля 1800) дарослыя, паколькі ў горадзе асобна працуе дзіцячая бібліятэка. Наведванні складаюць каля 15 тыс. у год. Канешне, гэта лічбы і паказчыкі, без якіх бібліятэчная работа не можа існаваць, але за кожнай лічбай стаіць канкрэтная асоба чытача, які прыходзіць у бібліятэку са сваім чытацкім густам і перавагай, настроем і жыццёвай устаноўкай, з добрымі або не вельмі навінамі, рознага ўзросту і роду заняткаў. Кожны, хто наведвае бібліятэку, цвёрда ведае, што яго сустрэнуць усмешкай, выслухаюць, дапамогуць, не адпусцяць без патрэбнай кнігі або інфармацыі, запросяць на мерапрыемства.

Паўсядзённай работай бібліятэкі з’яўляецца абслугоўванне чытачоў, сістэматызацыя фонду, рэдагаванне даведачна-бібліяграфічнага апарату, выключэнне літаратуры з фонду і інш. Бібліятэкары вядуць разнапланавую масавую работу, ладзяць цікавыя мерапрыемствы, падтрымліваюць стасункі са знакамітымі ўраджэнцамі краю.

Намаганнямі бібліятэкараў пастаянна дэманструецца фонд з дапамогай актуальных і крэатыўных выстаў. Інфарматыўнай і карыснай з'яўляецца пастаянна дзеючая краязнаўчая выстава «Давыд-Гарадок – слаўны горад над Гарынню», на якой прадстаўлена мноства матэрыялу па гісторыі, культуры і традыцыях Давыд-Гарадка. Пазнаёміцца, узяць кнігі з аўтографамі і пажаданнямі Г. Марчука, Л. Дранько-Майсюка – гэта проста! Аўтары неаднойчы рабілі літаратурныя падарункі бібліятэцы. Шмат каштоўных матэрыялаў перадаў бібліятэцы ганаровы грамадзянін Давыд-Гарадка, гісторык і краязнаўца, былы загадчык музея Мікалай Паўлавіч Бразоўскі. Менавіта бібліятэцы была даручана важная справа па захаванні і далейшым распаўсюджванні гэтых краязнаўчых набыткаў.


Акцыя «Чытаем кнігі пра вайну». 2022 г.

Да раскрыцця фонду калектыў падыходзіць творча і неардынарна. Калі наведвальнікам прапануецца класічная літаратура, то яна будзе аздоблена лялькамі-героямі твораў. Калі афармляецца выстава, якая заклікае да здаровага ладу жыцця, то яна абавязкова будзе з буклетамі, рэцэптамі і інш. Часта сваіх чытачоў бібліятэка запрашае ў бібліякафэ і прапануе літаратурнае меню – «прыгодніцкі салат», «паэтычны фрэш», «рамантычны дэсерт» і інш. З літаратурай аб лекавых раслінах і нават самімі лекавымі травамі можна знаёміцца на працягу ўсяго тыдня здароўя на выставе «Кніжны фітабар», а атрымаць трапныя прадказанні магчыма падчас «літаратурнай варажбы». Выставы для падлеткаў і моладзі – абавязкова са зваротнай сувяззю, а менавіта так званыя стыкер-выставы, дзе з дапамогай стыкераў чытачы пазначаюць кнігі або адказваюць на цікавыя пытанні. Часта падлеткі і моладзь прымаюць актыўны ўдзел у акцыях і іншых інтэрактыўных формах мерапрыемстваў па папулярызацыі здаровага ладу жыцця, экалагічнай асвеце, прававым і патрыятычным выхаванні.

Калі вярнуцца да краязнаўчай састаўляючай у дзейнасці бібліятэкі, то, канешне, трэба адзначыць, што пры ўстанове дзейнічае клуб аматараў-краязнаўцаў «Спадчына», створаны яшчэ ў 2007 г. Ва ўсе часы ў яго ўваходзілі наведвальнікі бібліятэкі, якія ведаюць і імкнуцца яшчэ больш пазнаць свой родны край, аматары-краязнаўцы, настаўнікі. Кожнае пасяджэнне аматарскага аб'яднання адкрывае штосьці новае і для сапраўдных знаўцаў свайго роднага горада, таму што яго гісторыя мае яшчэ шмат невядомых старонак. Тэмы для абмеркавання падчас пасяджэнняў могуць быць самымі разнастайнымі – ад традыцый і звычаяў насельніцтва Давыд-Гарадка да літаратурнага краязнаўства. Дарэчы, літаратурнае краязнаўства, напэўна, – асноўны напрамак дзейнасці бібліятэкі Давыд-Гарадка, які можна лічыць сапраўднай літаратурнай скарбонкай Палесся. Пасяджэнні аматарскага аб'яднання заўсёды праходзяць з карысцю для саміх удзельнікаў. Бібліятэкары запрашаюць да ўдзелу кампетэнтных, зацікаўленых людзей – краязнаўцаў, настаўнікаў, супрацоўнікаў музея і інш. Формы пасяджэнняў таксама разнастайныя – гэта і вечар паэтычнага настрою, дзе сваёй творчасцю дзеляцца пачынаючыя аўтары, краязнаўчы бібліягід «Гісторыі подых жывы» з удзелам старшыні Савета ветэранаў г. Давыд-Гарадка Генадзя Басаўца, краязнаўчая экскурсія пад кіраўніцтвам краязнаўца Мікалая Бразоўскага ў межах Года гістарычнай памяці па месцах горада і ваколіцах, якія звязаны са злачынствамі ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва Давыд-Гарадка і інш. Такія сустрэчы праходзяць не проста ў абмежаванай прасторы бібліятэкі, але і з наведваннем значных і цікавых мясцін горада – помнікаў і памятных мясцін, музея горада і інш.

Тэма краязнаўства ў рабоце Давыд-Гарадоцкай бібліятэкі не абмяжоўваецца дзейнасцю клуба «Спадчына», а наогул бярэ пачатак сярод падрастаючага пакалення і моладзі, каб узгадаваць сапраўдных краязнаўцаў і патрыётаў. Тэма малой радзімы, звычаі

і мясцовыя асаблівасці знаходзяць сваё адлюстраванне ў такіх мерапрыемствах, як краязнаўчы пошук (сумесна з музеем горада), бібліяквэст, бібліявелапрабег па ваколіцах горада і ў суседні аграгарадок, дзень беларускай культуры «Вандроўка ў родную мову», сустрэча з краязнаўцам. Дарэчы, інтарэс актыўнай зацікаўленай моладзі да мясцовых традыцый перарос у рэалізацыю праекта «Давыд-Гарадоцкія конікі як працяг беларускай традыцыі», які на абласным конкурсе праектаў для моладзі ў 2021 г. заняў трэцяе месца. Бібліятэка як захавальніца народных традыцый узяла на сябе справу вывучэння, папулярызацыі ўнікальнага абраду Давыд-Гарадка – «Конікі».

Не застаецца ў баку бібліятэка і падчас святкавання Дня горада. Яна прадстаўляе сваю бібліятэчную пляцоўку, на якой кожнаму гарадчуку і госцю свята знойдзецца занятак па душы і густу: літаратурная выстава кніг мясцовых аўтараў, фотаакцыя, акцыя-пажаданне «Камплімент роднаму гораду», гульні, віктарыны і конкурсы.

Бібліятэцы шанцуе на знакамітых наведвальнікаў. Хтосьці яе наведвае як бібліятэку свайго дзяцінства, хтосьці як установу, дзе заўсёды з павагай і інтарэсам выслухаюць, прапануюць цікавае мерапрыемства. Г. Марчук, творца, які не забывае сваю малую радзіму, чэрпае з яе свае літаратурныя вобразы і, канешне, пры магчымасці наведвае бібліятэку. Наведаў Георгій Васільевіч і бібліятэку Давыд-Гарадка пасля пераезду. У час святкавання Дня горада Г. Марчук разам з дачкой Наталляй наведалі горад, звярнуліся да землякоў, узгадалі бібліятэку і падарылі свае кнігі. У 2018 і 2020 гг. у самой бібліятэцы адбыліся цёплыя сустрэчы прыхільнікаў творчасці з аўтарам. Паэт-рамантык Л. Дранько-Майсюк таксама заўсёды наведвае бібліятэку. З апошніх сустрэч можна ўспомніць прэзентацыю кнігі «Кветкавы край Беларусі» сумесна з фотамастаком А. Кляшчуком у 2020 г. Гэты творчы праект асабліва дарагі для бібліятэкі і жыхароў горада, таму што распавядае пра адметнасці жыцця на Палессі, а тэксты, якімі суправаджаюцаа фотапрацы, так шчыра мог напісаць толькі чалавек, які генетычна звязаны з самабытным Давыд-Гарадком.

Заўсёды жаданымі ў бібліятэцы гасцямі з'яўляюцца мясцовыя аўтары – В. Вабішчэвіч, Г. Бабарыка, І. Петрашэвіч, Г. Вітко і інш.

Давыд-Гарадоцкая бібліятэка даволі жывая прастора, якая ўвесь час становіцца пляцоўкай для самых розных сустрэч – літаратурных, краязнаўчых, творчых і не толькі... Для жадаючых атрымаць кампетэнтную прававую дапамогу на базе бібліятэкі ладзяцца сустрэчы з натарыусам, для тых, каго хвалююць прыродаахоўныя і экалагічныя пытанні, запрашаюць іх на сумесныя мерапрыемствы з адпаведнымі спецыялістамі. Неаднаразова праходзілі сустрэчы з воінамі-інтэрнацыяналістамі, мясцовымі майстрамі і ўмельцамі, а сваіх пастаянных чытачоў, якім ўжо самім немагчыма наведваць бібліятэку, калектыў не забывае і абавязкова задавальняе чытацкія патрэбы па месцы жыхарства.

Супрацоўнічае бібліятэка з мясцовымі ўстановамі – гэта цэнтр дзіцячай творчасці, Дом культуры, музей горада, агульнаадукацыйныя школы.

У 2021 г. Давыд-Гарадоцкая бібліятэка стварыла акаўнт у сацыяльнай сетцы Instagram (@davidgorodokbib). Аператыўна, інфарматыўна, з густам і творчым падыходам асвятляе падзеі, якія адбываюцца ў бібліятэцы, падтрымлівае станоўчы імідж сярод насельніцтва. Вядуцца запатрабаваныя рубрыкі – «Вехі гісторыі», «Кніжная парада тыдня», прадстаўляе віртуальныя выставы, змястоўныя інфармацыйныя пасты да значных дат календара. Зараз акаўнт бібліятэкі налічвае больш за 1000 падпісчыкаў, з многімі бібліятэкары актыўна ўзаемадзейнічаюць праз анлайн-віктарыны, конкурсы, каментарыі і апытанні.

Па выніках 2019 г. Давыд-Гарадоцкая гарадская бібліятэка-філіял № 2 Столінскай раённай бібліятэчнай сістэмы занесена на раённую дошку гонару як лепшая ўстанова культуры. Пацвярджае сваю ўзнагароду бібліятэка і па сённяшні дзень, прычым у 2022 г. яна святкуе 75-годдзе з дня стварэння, а такая салідная дата толькі дадае ўпэўненасці, годнасці і разумення таго, што бібліятэка не страціла сваёй запатрабаванасці. Цешыць і думка, што прафесійны малады калектыў здзейсніць яшчэ шмат цікавых праектаў, а бібліятэка і надалей будзе месцам цёплых, цікавых, незабыўных сустрэч. Вось такія яны, вялікія справы маленькай бібліятэкі.

Summary

The article presents the activities of the Davyd-Gorodok city library-branch No. 2 of the Stolin district library system.

Яна Грубник



# ИНТЕРНЕТ-ПРОЕКТЫ В ПУБЛИЧНОЙ БИБЛИОТЕКЕ: ОТ ИДЕИ К РЕАЛИЗАЦИИ

Методист
Мозырской центральной
районной библиотеки
им. А.С. Пушкина

В настоящее время практически у каждого современного пользователя есть аккаунт в различных социальных сетях. Человек выбирает информацию по душе. Библиотека же старается присутствовать и активно продвигать книги и чтение во всех популярных социальных сетях. Именно здесь возникает вполне логичный вопрос – как это сделать? Ведь большинство пользователей заходит на свои страницы и листает ленту новостей для развлечения и отдыха. В связи с этим перед библиотекарями, которые решаются «покорять» социальные медиа, стоит нелегкая задача – создать такой контент, который будет легким, ярким, интересным и уникальным.

Первый шаг – выбор регулярных библиотечных рубрик. Здесь все просто. Берем книжный фонд и раскрываем его. Название такой рубрики даем исходя из того, какой конкретный фонд будем рекламировать: детский, отраслевой, книги на иностранных языках, книги-юбиляры, книги с автографами, краеведческие источники и др. Выбор безграничен. Очень важно выбрать одно направление и корректировать его, основываясь на отзывах ваших подписчиков. Такие рубрики позволяют показать те книги, которые должны побудить читателя взять их в библиотеке. Конечно, не забываем о легком стиле описания, а также про обложку книги в хорошем качестве. Можно дополнительно снять видеообзор по книге… Показать, какой шрифт, какие рисунки, да и вообще – доказать читателю, что эту книгу надо обязательно подержать в руках.

Конечно, страницы в социальных сетях создаются в поддержку сайта. Поэтому актуальные ссылки на ваш библиотечный сайт будут уместно смотреться в контенте. Только в этом деле нужно знать меру – согласитесь, если аккаунт пестрит ссылками, на него не так уж и хочется заходить. Это шаг номер два.



Ткачёва Ольга Николаевна, участница литературного салона, г. Гомель

Шаг номер три – общение. Комментарии (позитивные и негативные), лайки, репосты, посещения, сообщения и др. Все это возможно только в социальных сетях. Будьте вежливы, дружелюбны и старайтесь обходить острые темы. Не забываете, что в социальной сети вы представляете свое учреждение, имидж которого должны поддерживать.

Реклама – двигатель всего и даже вашего библиотечного аккаунта. Если вы сами не

расскажете про него – никто и не узнает. Ни коллеги, ни ваши читатели. Показывайте себя. Рассказывайте о себе. При любом удобном случае. Придумайте интернет-проект и привлеките в него как можно больше участников.

Хочется поделиться опытом Мозырской центральной районной библиотеки им. А.С. Пушкина по реализации интернет-проектов. Скажу правду: было страшно. Но, как говорится, глаза боятся, а руки делают. К работе мы приступили после детального анализа других международных интернет-проектов, в которых принимали участие. Первой «ласточкой» стал литературный фотомарафон «Сердце на ладони», посвященный 100-летию Ивана Петровича Шамякина. И… Нам понравилось! Множество постов-участников, безумно креативные идеи и новые друзья. Как такое может не понравиться?

Потом был литературный онлайн-салон «Увлеченные Пушкиным» в котором приняло участие еще большее количество пользователей социальных сетей. Кроме того, была организована сетевая новогодняя акция «Пушкинская елка». Яркая, красочная, не требующая серьезной подготовки, она стала прекрасным завершением 2021 г.



Комарицкая Ольга, участница литературного салона, Оренбургская область




Лобко Матвей, участник литературного салона, город Павлодар, Республика Казахстан

В чем секрет успеха этих акций? В их качественной и детальной разработке. Групповые обсуждения, поиск новых тем и форм, а также создание броской афиши – все это положительно сказывается на реализации интернет-проектов. Все это очень непросто. Начиная с выбора одной формы мероприятия из сотни предложенных и заканчивая абсолютным отсутствием идей для названия (да-да, точно такие же проблемы, как и для реального мероприятия).

Отдельно необходимо выделить работу над афишей. Что она должна содержать? Как ее проиллюстрировать? Какой шрифт выбрать? Естественно, это все должно быть подчинено общей теме проекта. Не стоит забывать, что афиша – это реклама, а реклама должна привлекать.

Чудес в мире интернет-проектов не бывает. Каждый новый подписчик – маленький результат вашего усердного, кропотливого, ежедневного труда. Не бойтесь создавать новое и воплощать свои идеи – в Интернете вы всегда найдете единомышленников!

Summary

The article presents the experience of organizing Internet projects in the Mozyr Central Regional Library named after A.S. Pushkin.

Вольга Камякевіч



Намеснік дырэктара
Зэльвенскай раённай
бібліятэкі

# І ЗНОЎ САБРАЎ НАС ГАННЕНСКІ КІРМАШ

Зэльвеншчына адзначала 301 год Ганненскага кірмашу. Як і заўсёды, супрацоўнікі бібліятэк прымалі актыўны ўдзел у розных мерапрыемствах свята. У першы дзень свята па добрай традыцыі ў Зэльвенскай раённай бібліятэцы адбылася паэтычная сустрэча «І зноў сабраў нас Ганненскі кірмаш», ганаровымі гасцямі якой сталі Ірына Войтка, Людміла Воранава-Супрун, Валянціна Драбышэўская і Сяргей Чыгрын.

З вялікім задавальненнем удзельнікі мерапрыемтва віталі на малой радзіме члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Ірыну Антонаўну Войтка, ураджэнку в. Каралін, якая падарыла свае цудоўныя вершы землякам, а для раённай бібліятэкі прыпаднесла новы






зборнік вершаў «Кранаюся вечнасці», які быў выдадзены ў 2021 г.

Яшчэ адзін госць – беларускі паэт, краязнавец, гісторык, літаратуразнавец, перакладчык, журналіст – Сяргей Мікалаевіч Чыгрын распавёў пра свае планы на творчай ніве. Расказаў, якім чынам ён звязаны з Зэльвеншчынай. Потым падарыў бібліятэцы зборнік вершаў для дзяцей «Слонік і гармонік».

Потым з прывітальным словам выступіла наша зямлячка, ураджэнка в. Залацеева Людміла Віктараўна Воранава-Супрун, педагог, гісторык, культуролаг і філосаф па адукацыі. Яна з’яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Расіі і Саюза пісьменнікаў



Беларусі. Многія вершы ў яе нараджаюцца пад акорды гітары. На мерапрыемстве ўсе прысутныя атрымалі асалоду не толькі ад паэтычных твораў аўтара, але і ад музычных.

Упершыню ў нас на Зэльвеншчыне ў якасці госця паэтычнай гасцёўні прысутнічала паэтка Валянціна Станіславаўна Драбышэўская, ураджэнка в. Вялікая Рагозніца Мастоўскага раёна, што знаходзіцца на мяжы з нашым раёнам. Валянціна Станіславаўна – член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Яна паведаміла прысутным, якое мае дачыненне да зэльвенскай зямлі. Валянціна Станіславаўна не толькі падзялілася сваёй творчасцю, але і расказала пра прафесійную дзейнасць. У заключэнне свайго выступлення падарыла асабісты зборнік вершаў «Чтоб у неба остаться в груди».

Мерапрыемства атрымалася вельмі цёплым, на працягу ўсяго часу яго не пакідала атмасфера добразычлівасці і цудоўнага настрою.

На другі дзень свята бібліятэкарамі Зэльвенскай раённай бібліятэкі было арганізавана падвор’е-інсталяцыя «Кніжная лаўка – ART-café». Як і належыць бібліятэцы, галоўным арт-аб’ектам на падворку былі кнігі, якія прадаваліся на кірмашы пудамі. Наведвальнікаў чакалі кніжныя выставы «Литературная ярмарка» і «Лошади в литературе». На першай выставе былі прадстаўлены кнігі не толькі пра Ганненскі кірмаш, але і пра кірмашы наогул. А на другой выставе знаходзіліся кнігі, у якіх распавядаецца пра галоўны сімвал Ганненскага кірмашу – коней. Дапаўненнем выставы былі цікавыя факты пра гэтых разумных істот і фотаздымкі помнікаў з конямі, якія ёсць у нашай краіне.

Наведвальнікам «ART-café» прапаноўвалася адказаць на пытанні віктарыны, за правільныя адказы ўсіх чакаў маленькі падарунак. На падворку-інсталяцыі ўсе жадаючыя змаглі атрымаць дыплом ганаровага госця




свята, выпісаны пяром уласнаручна. Карысталася попытам і фотазона, арганізаваная бібліятэкарамі.

Яшчэ на нашым падворку былі госці з Мінска – прадстаўнікі Выдавецкага дома «Звязда» і Уладзімір Мінавіч Мазго – наш зямляк, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, ганаровы грамадзянін Зэльвенскага раёна. У іх можна было набыць кнігі і нават з аўтографам аўтара, чым актыўна карысталіся госці свята.

На працягу ўсяго свята ў кніжнай краме панавала атмасфера пазітыву, было шматлюдна.

Summary

The article sums up the results of the Annensky kirmash, which was organized with the participation of the Zelva regional library.

Марина Рудаковская



Заведующая отделом Национальной библиотеки Беларуси

# ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНЫЙ КАПИТАЛ НАЦИИ И РОЛЬ БИБЛИОТЕК В ЕГО РАЗВИТИИ

В современном обществе знаний ключевым фактором развития любого государства является интеллектуальный капитал нации. Это имеет особую важность для Республики Беларусь. Наша страна не обладает природно-сырьевыми богатствами. Однако если в индустриальном обществе экономический приоритет принадлежал материальным ресурсам, то в обществе он сместился на интеллектуальные и постиндустриальном информационные ресурсы, что значительно повышает конкурентные преимущества белорусской экономики в мире и создает благоприятную основу для успешного социально-экономического развития.

Республика Беларусь может по праву гордиться своим интеллектуальным капиталом. Согласно различным исследованиям, наша страна стабильно занимает высокие позиции в мировых рейтингах интеллектуального развития.

Одним из самых распространенных индикаторов является коэффициент интеллекта IQ – количественный показатель, основанный на оценке мыслительных способностей человека. Согласно исследованию World Population Review, проведенному в Ольстерском университете, по данным на 2019 г. Беларусь заняла высокое 7-е место в общем рейтинге стран мира по уровню IQ. Средний коэффициент интеллекта белорусов составил 101,6 балла [4]. По уровню IQ наши соотечественники уступили только жителям Японии, Тайваня, Сингапура, Гонк-Конга, Китая и Южной Кореи. Вслед за Беларусью в первую десятку в рейтинге вошли Финляндия, Лихтенштейн, Нидерланды и Германия. Всего в исследовании были учтены показатели 199 стран мира. По мнению авторов, определяющим фактором величины среднего коэффициента интеллекта населения является уровень развития образования в стране.

Позиция Республики Беларусь в названном рейтинге не случайна. Традиционно высокий уровень качества белорусского образования отмечен и в других международных рейтингах. Так, по Индексу уровня образования в 2020 г. Беларусь заняла 32-е место среди 189 стран мира (индекс рассчитывается по показателям грамотности взрослого населения и совокупной доли учащихся, получающих начальное, среднее и высшее образование) [2].

